# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА
# ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Студзень 2024 года*

## 9 клас
## Варыянт 2

**Заданне 1.** Запішыце фанетычную транскрыпцыю вылучаных фрагментаў прыказак.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| Прыказка | Фанетычная транскрыпцыя |
|---|---|
| *З дурнем **счэпішся** – дурнем **зробішся**.* | |
| ***Ад хлусні не мруць**, толькі веры болей не даюць.* | |
| *Байка **з камара вырасце** на вала.* | |
| ***Гульня ў маладосці** дае хваробу на старыя косці.* | |
| *Ад зладзейства **не разжывешся**.* | |
| ***Раскажаш пра вераб'я**, а перакажуць пра жураўля.* | |

**Заданне 2.** Учытайцеся ўважліва ў фармулёўкі значэнняў мнагазначнага слова *ЗДАРОВЫ*. Запішыце прыклады (сказы або словазлучэнні) для кожнага значэння гэтага слова.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | Значэнне слова | Прыклады |
|---|---|---|
| 1 | Карысны для здароўя | |
| 2 | Які мае добрае здароўе; процілеглае *хворы* | |
| 3 | Разважлівы, разумны (перан.) | |
| 4 | Моцнага целаскладу; дужы (разм.) | |
| 5 | Непашкоджаны, які правільна дзейнічае (пра органы і часткі цела) | |
| 6 | Вялікі, моцны (пра з'явы, прадметы і пад.) (разм.) | |

**Заданне 3.** Абапіраючыся на прыведзеныя ў левым слупку табліцы дзеясловы, складзіце шэсць фразеалагізмаў, выкарыстоўваючы прапанаваныя ў наступным абзацы словы. Запішыце складзеныя фразеалагізмы ў правым слупку насупраць адпаведных ім значэнняў.

Словы-кампаненты для складання фразеалагізмаў: *глеба, з, зямля, і, куст, на, нага, па, рука, сабе, цана, цень*.

**Заўвага:** назоўнікі трэба ўжыць у форме патрэбнага склону і ліку.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | | |
|---|---|---|
| *азірацца* | ‘палохаючыся, старацца ўхіліцца ад адказнасці, ад справы’ | |
| *звязваць* | ‘пазбаўляць магчымасці свабодна дзейнічаць’ | |
| *зраўняць* | ‘поўнасцю разбурыць, знішчыць дашчэнту’ | |
| *набіваць* | ‘старацца ўзвысіць сябе ў вачах іншых, паказаць сябе больш значным’ | |
| *наводзіць* | ‘няславіць, ачарняць, выстаўляць у непрыглядным святле каго-, што-н.’ | |
| *намацваць* | ‘загадзя разведваць што-н., вызначаць шанцы на поспех’ | |

**Заданне 4.** Зменная частка слова, якая служыць для сувязі слоў у сказе, – гэта канчатак. Ці ўсе словы маюць канчатак? Ці заўсёды канчатак з’яўляецца матэрыяльна выражаным? Што абазначае паняцце «нулявы канчатак»? І, урэшце, ці ёсць словы, якія маюць два канчаткі? Правільныя адказы на гэтыя пытанні вам трэба ўспомніць для выканання наступнага задання: 1) размяркуйце прапанаваныя словы па асобных слупках табліцы; 2) у кожным слове (дзе гэта магчыма) вызначце канчатак.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

*Штосьці, вас, пазнаёміўшыся, тройчы, семдзесят, журы, свой, знайшлася, крыўдна, дзевяноста, джэм, узмор’е.*

| **Словы, якія не маюць канчатка** | **Словы з нулявым канчаткам** | **Словы з матэрыяльна выражаным канчаткам** | **Словы з двума канчаткамі (у тым ліку нулявымі)** |
|---|---|---|---|
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |

**Заданне 5.** Утварыце ад прапанаваных назоўнікаў адносныя прыметнікі і запішыце іх у табліцу.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| **Назоўнік** | **Прыметнік** | **Назоўнік** | **Прыметнік** |
|---|---|---|---|
| *Свіслач* | | *Ваўкавыск* | |
| *Добруш* | | *Гродна* | |
| *якут* | | *Залессе* | |
| *Свяцк* | | *узбек* | |
| *кіргіз* | | *Крывы Рог* | |
| *славак* | | *Доргунь* | |

**Заданне 6.** Значная колькасць маўленчых памылак звязана з дапушчэннем плеаназму, таўталогіі, неразмежаваннем паронімаў. Назавіце тып дапушчаных у сказе памылак. Запішыце выпраўлены варыянт сказа.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

**Для даведкі:**

Плеаназм – моўная з'ява, пры якой адбываецца паўтор слоў, аднолькавых ці блізкіх па значэнні.

Таўталогія – паўтарэнне ў межах сказа аднолькавых або аднакаранёвых слоў.

| | **Сказ** |
|---|---|
| А | Праца мастака ўзнагароджана высокай узнагародай. |
| Б | Пераможцы спаборніцтваў атрымалі дыпломы, медалі і памятныя сувеніры. |
| В | Кошт адной паездкі ў гарадскіх аўтобусах і тралейбусах павысіцца з 70 да 80 капеек за адну паездку. |
| Г | Асноўным прыярытэтам дзяржавы з'яўляецца чалавек і яго дабрабыт. |
| Д | Намеснік старшыні прывёў некалькі цікаўных прыкладаў. |
| Е | Пры ўзнікненні праблем з таварам прадавец можа звярнуцца да пакупніка з патрабаваннем прад'явіць гарантыйны талон. |

| **Сказ** | **Тып памылкі (у выпадку яе наяўнасці)** | **Выпраўлены варыянт** |
|---|---|---|
| А | | |
| Б | | |
| В | | |
| Г | | |
| Д | | |
| Е | | |

**Заданне 7.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

Пока была осень, Серёжа кормил воробьёв хлебом, но, когда наступила зима, он стал давать им ещё зерно. Потому что хлеб быстро замерзал, и воробьи не успевали его склевать. Серёжа очень жалел воробьёв, особенно когда начинались сильные морозы. Бедняги сидели взъерошенные, неподвижные, подобрав под себя замёрзшие лапки, и терпеливо ожидали угощения. Зато как радовались они Серёже! Стоило ему подойти к окну, как они слетались со всех сторон и спешили скорей позавтракать. *(По В. Чаплиной.)*

**Заданне 8.** Суаднясіце літаратуразнаўчыя паняцці і прыклады з мастацкіх твораў. Насупраць літары пастаўце нумар прыкладу. Звярніце ўвагу, што сярод літаратуразнаўчых паняццяў ёсць «лішнія».

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | |
|---|---|
| **А**<br>“Як Вас завуць?”<br>Пытаюся я<br>(Сягоння ж усе гадаюць).<br>І яна няголасна кажа:<br>“Аня”<br>*Максім Багдановіч* | |
| **Б**<br>Сняжыначкі-пушыначкі<br>Ляцелі матылькамі…<br>*Змітрок Бядуля* | |
| **В**<br>Каб яго пачулі, каб яго пазналі,<br>Каб яго, то слова, ды праўдай назвалі...<br>*Францішак Багушэвіч* | |
| **Г**<br>Няўжо сваёй зямлі забыў ты імя?<br>Ты без яе здаешся жабраком.<br>*Юрась Свірка* | |
| **Д**<br>Слова маё, не блудзі.<br>Ты не заблудзіш, я знаю.<br>*Казімір Камейша* | |
| **Е**<br>Вякамі стваралася наша дзяржава,<br>Пакуль прычакала світання зару.<br>*Алесь Ставер* | |

| |
|---|
| **1** Амфібрахій |
| **2** Анапест |
| **3** Дактыль |
| **4** Свабодны верш |
| **5** Параўнанне |
| **6** Анафара |
| **7** Рытарычнае пытанне |

| **А** | | **Б** | | **В** | | **Г** | | **Д** | | **Е** | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|

**Заданне 9.** З прыведзеных ніжэй назоўнікаў і прыметнікаў узнавіце назвы твораў беларускай літаратуры і назавіце іх аўтараў.

**Заўвага.** Прыметнікі і назоўнікі пададзены ў пачатковай форме – пры ўзнаўленні можа спатрэбіцца змена граматычнай формы. Сярод прыметнікаў ёсць лішнія.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

*Бедны, беларускі, ганарысты, горкі, крывавы, матчын, незагойны, пінскі, салодкі, слуцкі, чорны.*

*Парсюк, рана, шляхта, яблык.*

| Аўтар | Назва твора |
|---|---|
| | |
| | |
| | |

**Заданне 10.** Анлайн-бібліятэка «Пра Беларусь і беларусаў» арыентавана на тых, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі, яе культурай за межамі нашай Радзімы. Дапамажыце падабраць тры творы (запішыце іх назвы і аўтараў), якія адлюстроўваюць жыццё беларусаў у пачатку XX стагоддзя.

Апішыце адзін з твораў больш падрабязна: адзначце яго тэматыку, праблематыку, жанр і герояў. Пракаменціруйце, чаму гэта кніга будзе цікавая менавіта замежнаму чытачу. Сюжэт пераказваць нельга! Захаваем інтрыгу для чытачоў!!!

***Творы пра жыццё беларусаў у пачатку XX стагоддзя***

1. ______________________________
2. ______________________________
3. ______________________________

***Характарыстыка*** ______________________________
*(запішыце назву і аўтара твора)*

______________________________
______________________________
______________________________
______________________________
______________________________